# Дзяржавай упаўнаважаныя

## 100-гадовы юбілей адзначае беларуская дыпламатычная служба

**Гістарычныя карані беларускай дыпламатыі можна прасачыць яшчэ са старажытнасці. Як вядома, першае дзяржаўнае ўтварэнне на землях Беларусі – Полацкае княства – вяло актыўную знешнепалітычную дзейнасць. У часы ВКЛ беларуская дыпламатыя ўжо мела адметныя рысы і канкрэтную арганізацыйную форму, якую сённяшняй мовай можна назваць дыпламатычнай службай. Большую частку XX стагоддзя знешнепалітычны орган Беларусі не валодаў належнай шырынёй паўнамоцтваў, але менавіта ў савецкі час быў закладзены фундамент міжнароднага супрацоўніцтва, дзякуючы якому Міністэрства замежных спраў незалежнай Беларусі здолела хутка стаць эфектыўнай структурай ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі. Рэспублікай Беларусь устаноўлены дыпламатычныя адносіны амаль са 180 дзяржавамі, яна прадстаўлена з улікам сумяшчальнасці ў 109 краінах свету. Пра гістарычныя вытокі і сучасны стан беларускай дыпламатычнай службы разважалі ўдзельнікі круглага стала, арганізаванага Міністэрствам замежных спраў Беларусі з удзелам часопіса «Беларуская думка».**

ШАБЛЫКА Т.А.: **Цікава, якія думкі і справы выклікаў да жыцця такі важкі юбілей, як 100-годдзе беларускай дыпламатычнай службы?**

ДАПКЮНАС А.В.: Міністэрства замежных спраў з хваляваннем ставіцца да 100-гадовага юбілею дыпламатычнай службы, і, трэба сказаць, шмат што робіцца і ўжо зроблена да гэтай важкай даты. Напрыклад, з ініцыятывы міністра замежных спраў нашай краіны Уладзіміра Макея ўстаноўлены афіцыйныя геральдычныя сімвалы дыпслужбы Беларусі, службовыя знакі адрознення, зацверджана форменнае адзенне паслоў. Ладзяцца мерапрыемствы мемарыяльнага кшталту, у прыватнасці, звязаныя з юбілеямі людзей, якія працавалі ў міністэрстве. Усё гэта – магчымасць нагадаць пра гісторыю беларускага знешнепалітычнага ведамства.

Не так даўно мы вызначыліся з датай: вырашылі, што будзем адзначаць 100-годдзе ў Дзень дыпламатычнага работніка – 22 студзеня. Але ж гісторыя беларускай дыпламатыі, нават і службы дыпламатычнай, безумоўна, даўжэйшая за 100 гадоў. Ёсць пэўная ступень умоўнасці ў вызначэнні канкрэтнай даты. Ды і ці так на самай справе гэта важна?! Для мяне больш істотнае – спасціжэнне логікі гістарычнага развіцця, веданне фактаў, элементаў, кожнага імя, кожнай даты і падзеі, здарэнняў, канфліктаў, праблем, нявырашаных пытанняў, разуменне людзьмі, якіх цікавіць гісторыя дыпламатыі Беларусі, усяго гэтага як цэльнага працэсу.

ШЧАСНЫ У.Р.: Дарэчы, наконт усталявання ў Беларусі прафесійнага свята – Дня дыпламатычнага работніка ў Міністэрстве замежных спраў абмяркоўваліся розныя варыянты. Шукалі якуюнебудзь дату не ў далёкай гісторыі, а ў XX стагоддзі, каб узяць яе за аснову. Гучалі такія прапановы: далучэнне БССР да ААН альбо зацвярджэнне Палажэння аб дыпламатычнай службе Беларусі, ці нават пачаць з БНР…

ДАПКЮНАС А.В.: Бо ў БНР жа з'явіліся першыя дыпламатычныя пасады. Напрыклад, народны сакратар па замежных справах…



Андрэй Вадзімавіч ДАПКЮНАС, намеснік міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь



Уладзімір Рыгоравіч ШЧАСНЫ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол у адстаўцы



Віктар Генадзьевіч ШАДУРСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ



**ШЧАСНЫ У.Р.:** Але ж такой структуры, якая ўяўляла б сабой менавіта дыпламатычную службу, створана не было. Старшыня Рады БНР Язэп Варонка адначасова быў і сакратаром па замежных справах. А вось адпаведнай службы не існавала. Гэта істотны момант, паколькі вырашылі адзначаць дату стварэння менавіта дыпламатычнай службы Беларусі.

Дапамагла нам былая супрацоўніца, старшыня асацыяцыі ветэранаў Міністэрства замежных спраў кандыдат навук Зоя Леанідаўна Калантай. У газеце «Звязда» ад 22 студзеня 1919 года яна знайшла першае ўпамінанне пра Камісарыят замежных спраў ССРБ, які пачаў дзейнічаць у Мінску ў будынку па вуліцы Койданаўскай, цяперашняй Рэвалюцыйнай. Гэта першая ў найноўшай гісторыі Беларусі рэальная дзяржаўная структура, якая займалася знешнепалітычнай дзейнасцю. Таму было вырашана гэтую дату ўзяць за аснову і адзначаць як дзень дыпламатычнай службы – Дзень дыпламатычнага работніка.

**ШАДУРСКІ В.Г.:** Выбар зроблены, таму наша актуальная задача – даць ацэнку 100-гадовай гісторыі дыпламатычнай службы з пункту гледжання сённяшняга часу. Даследчыкам, дыпламатам, усім, хто цікавіцца гісторыяй, трэба спяшацца сабраць як мага больш дакументаў, фактаў. Гэта праца ўжо вядзецца. Кафедрай міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін БДУ разам з нашым МЗС выдадзены 10-томнік «Знешняя палітыка Беларусі: зборнік дакументаў і матэрыялаў», які ахоплівае перыяд з 1917 па 2010 год. У 2014 годзе выйшаў апошні том. Гэта выдатная магчымасць паглядзець на гісторыю знешняй палітыкі і дыпламатыі Беларусі XX – пачатку XXI стагоддзя. Аднак надзвычай важна зараз запісаць успаміны сведкаў знешнепалітычных падзей. Усё гэта дасць магчымасць тым, хто будзе пасля нас, больш аб'ектыўна ацаніць мінулае.

**СНАПКОЎСКІ У.Е.:** 100 гадоў – юбілей, які абавязвае і вучоных, і практыкаў да пэўных дзеянняў. Факультэт міжнародных адносін БДУ і Міністэрства замежных спраў Беларусі працуюць на адной глебе – міжнародных адносін. Вы, дыпламаты, робіце знешнюю палітыку, мы, вучоныя, яе даследуем і выкладаем. Часам мы ідзём паралельнымі курсамі, што заканамерна і абгрунтавана, а трэба, каб было больш перакрыжаванняў і супрацоўніцтва. Напрыклад, вучоныя факультэта могуць падрыхтаваць па заказу МЗС нарысы гісторыі беларускай дыпламатычнай службы за 100 гадоў яе існавання. Варта сказаць, што шэраг напрацовак у нас гатовы.

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Наконт кнігі абсалютна слушная прапанова. Хачу зазначыць, што ў сценах нашага міністэрства пэўная праца ў гэтым напрамку робіцца. З.Л. Калантай па ўласнай ініцыятыве збірае матэрыял для публікацый пра дзейнасць беларускай дыпламатычнай службы з 1919 па 1944 год. Яна знайшла шмат цікавых крыніц і ў айчынных архівах, і ў Маскве, Смаленску. Думаю, трэба зрабіць навукова-папулярнае выданне, цікавае не адным толькі навукоўцам. Ёсць ідэя стварыць фотаальбом, прысвечаны гісторыі дыпслужбы Беларусі. Гэта абсалютна рэальная справа.

З таго, што зроблена, варта назваць фільм, зняты А. Лукашэвічам і А. Аляксеевым па заказу і ў супрацоўніцтве з МЗС. Падчас працы над ім сабрана шмат розных матэрыялаў. Яны маглі б быць крыніцай звестак для далейшых публікацый, разлічаных на шырокае кола чытачоў. Зразумела, патрэбны і даследчыцкія артыкулы – для спецыялістаў.

**ДАПКЮНАС А.В.:** Фільм – гэта прыклад таго, як сухая гісторыя набывае жывое аблічча. Перад намі цяпер стаіць задача грунтоўнага асэнсавання таго, што ўяўляе сабой дыпламатычная гісторыя Беларусі, з усімі напрацоўкамі, што ў нас сёння ёсць, з дзясяткамі навуковых прац. Я ўдзячны калегам, якія сваім унёскам, сваёй працай ствараюць такі летапіс. Бо гэта важна не толькі для шырокай грамадскасці, журналістаў, навукоўцаў і студэнтаў, а найперш для саміх дыпламатаў.

**СНАПКОЎСКІ У.Е.:** У буйных краінах з вялікімі міністэрствамі замежных спраў ёсць спецыяльныя аддзелы ці

ўпраўленні, якія выдаюць шматтомныя зборнікі дакументаў, дзе адлюстравана іх дыпламатычная гісторыя. У нашага міністэрства, як я разумею, пакуль няма такой магчымасці.

**ШАДУРСКІ В.Г.:** Сумеснымі намаганнямі даследчыкаў і дыпламатаў трэба зрабіць добра ілюстраванае выданне з успамінамі і фотадакументамі. Матэрыял лепш падаць у храналагічным парадку. Калі гаварыць больш агульна, то сёння неабходна вырашаць дзве асноўныя звязаныя паміж сабой задачы. Першая – працягваць весці навуковыя даследаванні, збіраць архіўныя матэрыялы і, пакуль ёсць магчымасць, успаміны. Другая, таксама не менш сур'ёзная, – больш актыўная папулярызацыя беларускай гісторыі, у тым ліку дыпламатычнай. Напэўна, на яе трэба зрабіць акцэнт. Бо папулярызацыя ведаў аб мінулым нашага народа спрыяе фарміраванню больш высокай нацыянальнай ідэнтычнасці.

На парадку дня і яшчэ адна задача – алічбаванне архіўных дакументаў. Такім чынам гістарычныя дакументы будуць даступныя ўсім тым, хто імі зацікавіцца. Дарэчы, справай алічбавання маглі б займацца студэнты ФМА падчас практыкі ў Міністэрстве замежных спраў. Такі напрамак супрацоўніцтва магу прапанаваць…

**ВЯЛІКІ А.Ф.:** Відавочна, 100-годдзе – гэта ж не аднадзённая дата. Мы цэлы год можам ладзіць мерапрыемствы, ствараць кнігі. Найперш нам трэба было б выдаць біяграфічны даведнік персаналій – пра ўсіх беларускіх дыпламатаў, якіх не так і многа. Вось хто ведае сёння «таварыша У», як яго ў свой час называлі калегі? Гэта наш зямляк Аляксандр Ульянаў. З 1925 года ён быў саветнікам па справах БССР (у рангу аташэ) пры пасольстве СССР у Польшчы, пазней выконваў абавязкі савецкага пасла ў Варшаве, у 1928–1931 гадах – гандлёвы прадстаўнік СССР у Чэхаславакіі.

Тут прагучала вельмі слушная прапанова наконт лічбавай апрацоўкі дакументаў. Напрыклад, расійскае Міністэрства замежных спраў 400 тысяч дакументаў выклала ў адкрыты інтэрнэт-доступ. І шматтомныя выданні не патрэбны – кожны студэнт, навуковец, хто іншы на кнопку націсnуў і атрымаў звесткі. Лічу, што наша задача як вучоных падказаць, дзе, у якіх архівах знаходзяцца найбольш важныя і цікавыя дакументы па айчыннай дыпламатычнай гісторыі, і намагацца атрымаць хаця б іх копіі.

**ДАПКЮНАС А.В.:** Сэрцам успрымаю заўвагу, што трэба больш шчыльна нам разам працаваць. Пытанне адкрытасці, пытанне аб'яднання намаганняў – гэта важны для нас практычны бок справы. Формы нашага супрацоўніцтва могуць быць розныя. Аднак неаспрэчна тое, што больш шырокі доступ да архіўнай інфармацыі, і не толькі даследчыкам, будзе садзейнічаць распаўсюджанню і паглыбленню ведаў пра беларускую дыпламатычную традыцыю і ўмацаванню самой гэтай традыцыі.

**ВЯЛІКІ А.Ф.:** Мы з Уладзімірам Еўдакімавічам Снапкоўскім працавалі ў архіве МЗС у Варшаве. Ведаеце, там ёсць усе арыгіналы дакументаў па вызначэнні і дэмаркацыі беларуска-польскага ўчастка пасляваеннай савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. Дэмаркацыя праходзіла на працягу 1946–1948 гадоў, і нам важна ведаць, як усё адбывалася, як дзялілі нашу граніцу на яе кожным метры. Прынамсі, справа тычыцца сучаснай беларуска-польскай граніцы. А ў нас нават копій няма гэтых найважнейшых для нашай дзяржавы дакументаў. Трэба нейкім чынам атрымаць іх, алічбаваць, каб даследчыкі маглі выкарыстоўваць.

Наогул жа, неабходна стварыць камісію з гісторыкаў, архівістаў і дыпламатаў і вызначыць, якія дакументы з Нацархіва, з ведамаснага архіва МЗС можна размяшчаць у адкрытым доступе, каб імі маглі карыстацца і студэнты, і выкладчыкі, і ўсе зацікаўленыя. Мы як навукоўцы гатовы аказваць кансультацыйную дапамогу, што ў першую чаргу трэба размясціць у інтэрнэце. Гэта будзе спрыяць пашырэнню і паглыбленню ведаў аб нашай краіне ў свеце. А, магчыма, нейкі дакумент зараз не трэба друкаваць, бо час не наспеў…

**ШАДУРСКІ В.Г.:** Мне ўяўляецца, кнігу пра дыпламатаў Беларусі падрыхтаваць не так і цяжка. Міністэрства замежных



**Уладзімір Еўдакімавіч СНАПКОЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры факультэта міжнародных адносін БДУ**



**Анатоль Фёдаравіч ВЯЛІКІ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гістарычнага факультэта БДПУ імя М. Танка**










спраў ад стварэння ў 1944 годзе да абвяшчэння незалежнасці Беларусі было невялікім – не больш за 30 супрацоўнікаў. Што тычыцца дакументаў пасляваеннага часу, яны добра захаваліся. Цяжэй са звесткамі пра асоб 1920-х гадоў…

**ВЯЛІКІ А.Ф.:** Частка дакументаў ёсць у Нацыянальным архіве, некаторыя матэрыялы мы можам самі скніраваць і размяшчаць.

Наконт кнігі… На мой погляд, узгадаць імёны нашых дыпламатаў – гэта высакародная справа, бо як гісторыю, так і дыпламатыю робяць людзі. Толькі адзін прыклад. Многія ведаюць, што ў Мінску на Вайсковых могілках пахавана Рут Уолер – амерыканская супрацоўніца беларускай місіі ЮННРА. Была такая арганізацыя ААН у справе дапамогі і аднаўлення краін, якія найбольш пацярпелі ад вайны. У ліку 18 дзяржаў атрымоўвала такую дапамогу ў 1945–1947 гадах і БССР. Але, я ўпэўнены, нават не кожны наш прафесійны дыпламат ведае, хто з беларусаў узначальваў гэтую місію.

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Са свайго боку хачу дадаць, што зусім не вывучаны дакументы па гісторыі Пастаяннага прадстаўніцтва БССР у Маскве, якое было створана ў 1921 годзе.

**ВЯЛІКІ А.Ф.:** Па гэтай тэме няма ніводнай сур’ёзнай навуковай працы. А яна вельмі глыбокая, бо закранае ўзаемаадносіны па вертыкалі: Цэнтр (Масква) – перыферыя (Мінск). Якая была нарматыўна-прававая база дзейнасці прадстаўніцтва, хто і ў якія гады яго ўзначальваў, якія пытанні вырашаліся…

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Між тым дакументы знайшліся: і ў Нацархіве, і ў Маскве, у Смаленску. І дзейнасць нашага першага камісарыята па замежных справах зусім слаба вывучана.

**СНАПКОЎСКІ У.Е.:** Некаторыя дакументы 1920-х гадоў пра дзейнасць Народнага камісарыята замежных спраў БССР апублікаваны ў выданнях, якія ўжо згадваліся тут, і ў іншых зборніках. Я прынёс копіі шэрага дакументаў таго часу з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. У адным, напрыклад, прыведзены спісачны склад супрацоўнікаў НКЗС (больш за 40 асоб, у тым ліку больш за 20 дыпламатычных работнікаў) на 1922 год.

У англамоўным даведніку пра міністэрствы замежных спраў дзяржаў свету, выдадзеным у 1989 годзе, адлік беларускай дыпламатычнай службы вядуць ад першага ўрада БНР пад кіраўніцтвам Я. Варонкі. Ёсць звесткі і пра першага наркама замежных спраў ССРБ Усевалада Фальскага, тэрмін працы якога на гэтай пасадзе памылкова акрэслены студзенем – сакавіком 1919 года. Увогуле дакументаў пра першыя гады дзейнасці НКЗС ССРБ не так мала, але яны раскіданы па розных краінах, архівах і фондах.

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Дакументаў па гісторыі беларускай дыпламатычнай службы ў прынцыпе шмат. Іх можна адшукаць і ў падшыўцы «Звязды» за пачатак 1920-х гадоў, і ў асобных фондах Беларускага гістарычнага архіва. Калі мы ў найноўшай гісторыі Беларусі стварылі дыпламатычную службу, апарат МЗС, адкрылі нашы замежныя прадстаўніцтвы, то задумаліся, што трэба зрабіць базу даных па міжнародных кантактах беларускіх зямель, сабраць дакументы, пачынаючы з XI і заканчваючы XX стагоддзем. І тое-сёе ўдалося зрабіць. Аказалася, што ў нас не было нават копій Рыжскага дагавора 1921 года, Брэсцкага мірнага дагавора, дакументаў па «Лініі Керзана», згодна з якімі, між іншым, была вызначана цяперашняя мяжа Беларусі з Польшчай. Атрымалі копіі з Варшавы, Лондана. Многа матэрыялаў нам прыслалі з МЗС Расіі.

Ведаеце, патрэбны менавіта такія кардынальныя дакументы, бо існуе шмат дробных, сярод якіх мы часам губляемся. За аснову трэба браць грунтоўныя дакументальныя крыніцы і пэўную тэму даследавання. А проста вывучаць усё, што ёсць, гэта марнаванне часу.

**ШАБЛЫКА Т.А.:** **Прабачце, але ў мяне такое, напэўна, дылетанцкае пытанне. Мы можам гаварыць пра пэўную самастойнасць беларускай дыпламатычнай службы ці ўсё ж яна была часткай агульнасаюзнай?**

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Ведаеце, самастойнасць у дыпламатыі рэч адносная. Заўсёды існуюць дзяржавы, групы краін, якія каар-



дынуюць сваю дзейнасць. І калі гаварыць пра сітуацыю да 1991 года, то, канечне ж, была каардынацыя дзеянняў беларускай дыпслужбы з дэлегацыямі СССР, УССР, сацыялістычных краін у межах дзейнасці ААН. Можна правесці паралель з цяперашняй каардынацыяй дзеянняў дзяржаў унутры Еўрапейскага саюза, калі краіна-каардынатар робіць узгодненую з іншымі членамі заяву ад імя ЕС па той ці іншай міжнароднай праблеме.

Такім чынам, каардынацыя заўсёды існуе. Але ў савецкія часы было размеркаванне нейкіх напрамкаў. Скажам, беларуская дэлегацыя актыўна займалася праблемамі раззбраення. Таму некаторыя напрамкі знешняй палітыкі СССР выпрацоўваліся ў Мінску. Менавіта дэлегацыя БССР у ААН была адказнай за давядзенне да сусветнай грамадскасці падыходаў да гэтай тэмы і прыняцце адпаведных дакументаў. Рыхтаваліся праекты рэзалюцый, нашы дыпламаты займаліся іх прасоўваннем, прыняццем, падборам суаўтараў і г. д.

Напрыклад, у Трэцім камітэце ААН мы актыўна праводзілі ідэю сацыяльных правоў. Таму што, акрамя палітычных і грамадзянскіх правоў, ёсць яшчэ і сацыяльныя, якія Захадам заўсёды ігнараваліся. СССР, БССР і УССР, усім сацыялістычным краінам заўсёды было што сказаць на гэты конт, яны маглі пераканаўча прадэманстраваць, як іх урадамі гарантуюцца сацыяльныя правы. Таксама мы актыўна ініцыіравалі разгляд, рыхтавалі праекты рэзалюцый па пытаннях апартэіду і барацьбы з каланіялізмам.

Беларусь першай, яшчэ да прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў ліпені 1990 года, ініцыіравала разгляд міжнароднай супольнасцю праблемы Чарнобыля. Была прынята адпаведная рэзалюцыя. І не толькі наконт чарнобыльскай праблематыкі, а наогул адносна прадухілення наступстваў тэхнагенных катастроф. Таму нельга сказаць, што мы абсалютна ішлі ў фарватары Савецкага Саюза. Канечне, была поўная каардынацыя, але актыўнасць менавіта беларускіх дыпламатаў была заўважная.

**ШАДУРСКІ В.Г.:** Давайце вернемся ў больш далёкае мінулае. Студзень 1919 года. Створаны наркамат замежных спраў, у штаце якога працавалі наркам У. Фальскі і яшчэ дзясятак супрацоўнікаў. У наркамата было сваё памяшканне. У складзе ўрада Літоўска-Беларускай ССР, сфарміраванага ў лютым 1919 года, наркамат па замежных справах ужо адсутнічаў. У снежні 1920 года пастановай ІІ з'езда Саветаў Беларусі былі створаны Народны камісарыят па замежных справах. Ён дзейнічаў да ліпеня 1923 года. Пасля стварэння СССР існавалі розныя фарматы каардынацыі міжнароднай дзейнасці паміж Масквой і Мінскам. Аднак гаварыць аб самастойнасці беларускай дып-



312

Совет Народных Комиссаров Белорусской ССР

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 1330

от 31 августа 1945 г. г. Минск

Об утверждении Устава Организации Об"единенных Наций.

Совет Народных Комиссаров Белорусской Советской Социалистической Республики ПОСТАНОВЛЯеТ:

Устав Организации Об"единенных Наций, подписанный в гор. Сан-Франциско /США/ 26 июня 1945 г., утвердить и представить на ратификацию в Президиум Верховного Совета Белорусской ССР.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР /П.Пономаренко/

УПРАВЛЯЮЩИЙ ДЕЛАМИ СОВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР /С.Костюк/

▲ **Пастанова СНК БССР аб зацвярджэнні Статута ААН. Жнівень 1945 года**

службы да таго часу, калі Беларусь стала суверэннай дзяржавай, падстаў няма. Між тым некаторыя рысы фармальнай суверэннасці БССР усё ж існавалі. Напрыклад, у 1945 годзе Беларуская ССР атрымала статус краіны – заснавальніцы ААН. Для міжнароднай супольнасці гэта азначала пэўнае прызнанне беларускага суверэнітэту. Дарэчы, статус Беларусі значна павялічыў цікавасць да яе з боку замежных навукоўцаў. Так, у выдавецтве Гарвардскага ўніверсітэта (ЗША) у 1956 годзе выйшла навуковая манаграфія М. Вакара на англійскай мове «Беларусь: фарміраванне нацыі». Зразумела, у многіх замежных працах былі і недарэчнасці, і памылкі. Так, у адным з французскіх дапаможнікаў назву «Belorussia» пераклалі як «белагвардзейская Расія».

**ШЧАСНЫ У.Р.:** Калі сказаць коратка: як толькі Беларусь падпісала Статут ААН, то адразу стала суб'ектам міжнароднага права…

**ШАДУРСКІ В.Г.:** Міжнароднае прызнанне БССР можна лічыць у пэўнай ступені крытэрыем фармальнай суверэннасці беларускай дыпламатычнай службы. Хачу нагадаць, што ў 1920-я гады БССР прызналі Польшча і Германія. Зразумела, у гэтым прызнанні былі свае ўмоўнасці і акалічнасці. Тым не менш у сакавіку 1992 года Рэспубліка Беларусь вельмі ўдала выкарыстала гэты гістарычны факт і прапанавала Германіі не «ўстанавіць», а «ўзнавіць» дыпламатычныя адносіны паміж краінамі. Парадокс заключаецца ў тым, што Беларусь ніколі не разрывала дыпламатычныя адносіны з Германіяй, нават нягледзячы на Другую сусветную вайну… І нямецкі бок у асобе тагачаснага кіраўніка знешнепалітычнага ведамства ФРГ Ганса-Дзітрыха Геншэра пагадзіўся з такім падыходам.

**СНАПКОЎСКІ У.Е:** Пытанне аб самастойнасці і незалежнасці беларускай дыпламатычнай службы савецкага часу прынцыповае. У 1982 годзе ў Рызе была канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю стварэння СССР, на якой я, малады вучоны, у сваім выступленні ўжыў тэрмін «беларуская дыпламатыя». Мяне тады паправілі маскоўскія калегі, зазначыўшы, што ў савецкай знешняй палітыцы не можа быць беларускай дыпламатыі. У нашай сумеснай з С.Д. Вайтовічам публікацыі было папраўлена: «беларускі атрад савецкай дыпламатыі». Гэта яскрава сведчыць пра тое, якім было наша месца.

Не выкарыстоўвалася і такое паняцце, як «знешняя палітыка БССР»: замест яе была «знешнепалітычная дзейнасць». І ў Канстытуцыю БССР 1978 года ўключана адпаведная фармулёўка: «БССР у сваёй знешнепалітычнай дзейнасці кіруецца мэтамі, задачамі і прынцыпамі савецкай знешняй палітыкі, вызначанымі ў Канстытуцыі СССР» (арт. 28). Вось дакладная і жорсткая формула, якая акрэслівала межы дзеянняў рэспублікі на міжнароднай арэне.

**ДАПКЮНАС А.В.:** На маю думку, гэта не тычыцца дыпламатычнай службы. Яна выконвала канкрэтныя дзеянні. Таму свая дыпламатычная служба ў нас была.

СНАПКОЎСКІ У.Е.: Несумненна, дыпламатычная служба БССР існавала з моманту стварэння НКЗС, але яна была неад'емнай часткай дыпламатычнай службы РСФСР, а потым СССР. Наконт міжнародна-прававога статусу БССР... Гэта таксама галаваломка для замежных спецыялістаў міжнароднага права. Фармальна ўсе саюзныя рэспублікі лічыліся суб'ектамі міжнароднага права, але фактычна іх знешнепалітычныя паўнамоцтвы былі абмежаваны саюзным цэнтрам. Існаваў «абмежаваны міжнародна-прававы статус БССР і УССР». Шырока вядомы факт, як Польшча, Вялікабрытанія і ЗША спрабавалі ўстанавіць дыпламатычныя адносіны з БССР і УССР, але з Масквы адразу паступіла катэгарычная адмова…

ШАБЛЫКА Т.А.: **Якія найбольш складаныя ці найбольш цікавыя перыяды можна адзначыць у 100-гадовай гісторыі беларускай дыпламатычнай службы?**

СНАПКОЎСКІ У.Е.: Самы цяжкі перыяд у дыпламатычнай дзейнасці Беларусі – гэта 1923–1938 гады. Тады мы пазбавіліся сваёй дыпламатычнай установы, замест якой было створана Упраўленне ўпаўнаважанага НКЗС СССР пры СНК БССР. Гэтая структура выконвала пэўныя функцыі, але не была паўнапраўным знешнепалітычным ведамствам. У 1938 годзе Упраўленне было ліквідавана, і БССР, як усе астатнія саюзныя рэспублікі, засталася нават без такога, калі можна так сказаць, сурагату знешнепалітычнага ведамства. Да лютага 1944 года ўз'яднаная БССР пражыла без уласнай дыпламатычнай службы.

Але самая драматычная старонка, бясспрэчна, Рыжскі мірны дагавор. Тут варта працытаваць ліст старшыні Ваеннарэвалюцыйнага камітэта БССР А. Чарвякова з Рыгі ад 20 верасня 1920 года. Дарэчы, са жніўня 1921 года ён стаў і наркамам замежных спраў. Вось ён у Рызе, чакае, і ад яго нічога не залежыць: «Такое выжидание, ничегонеделание – очень тяжело. Но ничего не поделаешь. Хуже всего то, что раздел Беларуси уже предрешен и что этим мое доброе белорусское имя будет скомпрометировано навеки». Вось вам маральная самаацэнка палітыка, які апынуўся ў віры трагічных падзей...

Таксама прыкры дакумент – мандат, выдадзены ВРК БССР дэлегацыі РСФСР на чале з А. Ёфэ 10 верасня 1920 года. У прынятай пастанове РСФСР быў прадстаўлены «самы шырокі мандат на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанні, галоўным чынам, вызначэння межаў Беларусі». Фармальна гэта значыла, што адна дзяржава давала ўсе паўнамоцтвы і правы іншай дзяржаве падзяліць яе тэрыторыю. Другі Усебеларускі з'езд Саветаў у канцы 1920 года прызнаў правільнасць гэтага мандата і самога факту падзелу, маўляў, нічога не зробіш. Гэта чорная старонка нашай гісторыі і дыпламатыі…

ДАПКЮНАС А.В.: У гэтай сувязі ў мяне ўзнікаюць вось якія думкі. Ці апраўдана, ці справядліва сённяшнім аршынам аналітычным, маральным мераць дзеянні нашых папярэднікаў? Асабіста для мяне галоўнае – становучае стаўленне да таго, што ў іх атрымалася зрабіць для ўмацавання краіны, для яе развіцця, а не крытычнае, з пазіцыі таго, што нам сёння трэба, што хацелася б вось на гэты момант мець…

ШАДУРСКІ В.Г.: Сапраўды, як нам сёння падыходзіць да асоб, што працавалі на дыпламатычнай ніве ў мінулыя часы? Як ацэньваць іх дзейнасць? Нягледзячы на тое, што гісторыкі заклікаюць усіх быць аб'ектыўнымі, абапірацца на прынцып гістарызму, на справе паслядоўнікі вельмі часта падыходзяць да ацэнкі працы папярэднікаў з максімальнымі патрабаваннямі. Маўляў, чаму яны не зрабілі так ці гэтак? Напрыклад, той жа Аляксандр Чарвякоў: чаму ён не змагаўся супраць тэрытарыяльнага падзелу БССР паводле Рыжскага дагавора 1921 года? На мой погляд, трэба даваць ацэнку гістарычным асобам па прынцыпе, што зрабіў чалавек, а не зыходзячы з таго, што ён не зрабіў. З пісьмаў А. Чарвякова нам вядома: як кіраўнік урада БССР ён добра разумеў, што парушаюцца правы Беларусі, у адносінах да яе прымаюцца не зусім прыстойныя рашэнні. Але ён рабіў тое, што мог у тых умовах.

ВЯЛІКІ А.Ф.: Ёсць цікавыя ўспаміны Івана Шамякіна «Роздум на апошнім перагоне», дзе апісваюцца дзеянні і паводзіны беларускіх дыпламатаў у ААН, як праходзілі Генасамблеі, рыхтаваліся і прымаліся пастановы і г. д. Шамякін удзельнічаў у пасяджэннях як Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і як старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі. Я працытую адзін урывак: «Прыстойнасць, чалавечая годнасць патрабавалі, каб мы галасавалі разам з амерыканцамі. Не, нашы саюзныя шэфы здзекліва з нас пасмейваліся, і мы галасавалі так, як казала саюзная дэлегацыя». Вось такія рэальныя факты і ацэнкі.

ШАДУРСКІ В.Г.: Гісторыкі могуць спрачацца аб гістарычнай перыядызацыі, але, натуральна, былі перыяды большай актыўнасці беларускай савецкай дыпламатыі. Гэта, зразумела, студзень 1919 года, потым перыяд з канца 1920 да ліпеня 1923 года. З сакавіка 1944-га, калі пачалася «бітва за ААН», бачым актывізацыю створанага знешнепалітычнага ведамства на чале з К.В. Кісялёвым. Пашырэнне замежных сувязяў адзначана пасля 1954 года, калі Савецкі Саюз разам з Беларуссю і Украінай уступіў у ЮНЕСКА. У апошнія месяцы існавання СССР мы зноў жа назіраем ажыўленне міжнародных стасункаў Мінска. Наконт перыяду канца 1980-х – пачатку 1990-х гадоў працягваюцца спрэчкі, ад якой падзеі пачынаць адлік беларускай суверэннай дыпламатыі. З афіцыйнага распаду СССР (снежань 1991 года) ці з Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, урачыста прынятай Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 года?

ШАБЛЫКА Т.А.: **Відавочна, што гісторыя беларускай дыпламатыі перасягае межы гісторыі беларускай дыпламатычнай службы?**

ШАДУРСКІ В.Г.: Так. Паняцце «беларуская дыпламатыя» і больш шырокае, і больш глыбокае ў гістарычным сэнсе. Беларускія землі ўваходзілі ў розныя дзяржаўныя ўтварэнні, дзе іх прадстаўнікі мелі пэўную актыўнасць. Гэта ўсё можна дадаць у скарбонку беларускай дыпламатыі. Напрыклад, наш зямляк Іосіф Гашкевіч – першы расійскі консул у Японіі, стваральнік першага руска-японскага слоўніка і г. д. Нарадзіўся ён у Беларусі і вярнуўся сюды пасля адстаўкі. Тут славуты дыпламат і навуковец пахаваны. Няўжо нам не варта лічыць яго прадстаўніком беларускай дыпламатыі?

У савецкі час дзясяткі беларусаў працавалі ў міжнародных структурах сістэмы ААН, бо БССР была членам шматлікіх арганізацый. Гэта была эфектыўная школа для нашых дыпламатаў. Пабыўшы там, яны вярталіся ў Беларусь і расказвалі, вучылі маладое пакаленне. Відавочна, рабілі ўплыў на навуковае, грамадскае асяроддзе БССР. На жаль, такі чалавечы фактар яшчэ мала ацэнены.

ДАПКЮНАС А.В.: Хацелася б ведаць, наколькі сённяшнія дыпламаты, маладыя і больш сталага ўзросту, разумеюць важнасць адчування гэтага фундаменту, што гісторыя пачалася не з нас і не сёння. І нават не 10, не 100 гадоў таму. Для мяне, як аднаго з супрацоўнікаў МЗС, важна, каб мае калегі і я сам былі не проста адміністратарамі, чыноўнікамі, а каб найперш кожны з нас адчуваў сябе грамадзянінам незалежнай дзяржавы, дзейнічаў як грамадзянін. Наогул жа беларуская дыпламатыя – гэта справа не толькі тых некалькіх соцень чалавек, якія працуюць у МЗС...

ШАДУРСКІ В.Г.: Можна сказаць, што наша дыпламатыя сталела праз асобы. Дарэчы, калі Савецкі Саюз распаўся, у сістэме МЗС СССР было 110 дыпламатаў – ураджэнцаў Беларусі. Варта ўзгадаць Уладзіміра Сянько, які вярнуўся ў Мінск з Масквы пасля абвяшчэння незалежнасці і працаваў на розных пасадах у МЗС, у тым ліку у 1994–1997 гадах міністрам. Наш зямляк Пётр Абрасімаў быў паслом СССР у Польшчы, ГДР, Францыі, Японіі, Малагасійскай Рэспубліцы. Станіслаў Пілатовіч з 1971 па 1978 год прадстаўляў СССР у Польшчы. У ПНР паслом Савецкага Саюза працаваў і Аляксандр Аксёнаў, былы старшыня ўрада БССР. Можна прыгадаць і былога кіраўніка Савецкай Беларусі Панцеляймона Панамарэнку, які з 1955 года быў

Беларуская Думка

Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом СССР у Польшчы, з 1957 – у Індыі і Непале, з 1959 года – у Нідэрландах. Уладзімір Бровікаў таксама працаваў на высокай пасадзе пасла ў ПНР у 1985–1990 гадах. Пасламі Савецкага Саюза ў КНДР былі ўраджэнцы Беларусі Глеб Крывулін, а потым Генадзь Барташэвіч. Варта ўспомніць і нашага бліскучага дыпламата і выкладчыка Віталя Смірнова, які прадстаўляў БССР у ААН, быў паслом СССР у Пакістане (1980–1985), у Бангладэш (1988–1991). Зразумела, нельга пакінуць без увагі Андрэя Грамыку, вядомага савецкага дыпламата. Сёлета будзе 110 гадоў з дня яго нараджэння. Гэтыя людзі рабілі вялікую працу, за гэта ім трэба сказаць дзякуй.

ШАБЛЫКА Т.А.: **Якія асобы пакінулі найбольш значны след у гісторыі дыпслужбы Беларусі?**

ВЯЛІКІ А.Ф.: Я б найперш назваў Кузьму Венядзіктавіча Кісялёва. У 1944 годзе яго прызначылі наркамам, потым міністрам замежных спраў БССР. На гэтай пасадзе Кісялёў працаваў 22 гады – да 1966-га. Менавіта дзякуючы яму Беларусь з часам стала суб’ектам міжнароднага права і вядомай міжнароднай супольнасці. Паказальны факт: ён заўсёды папраўляў міжнародных апанентаў: мы – Беларусь, а не White Russia (Белая Русь).

ШЧАСНЫ У.Р.: Пра значнасць яго асобы сведчыць і той факт, што ён выратаваў сваіх супрацоўнікаў ад арышту. Аднойчы ў 1951 годзе Кісялёў прыйшоў на працу, а ў наркамаце засталіся толькі прыбіральшчыцы. Усе супрацоўнікі былі арыштаваны. Тады ён паехаў у Маскву, дамогся сустрэчы са Сталіным і папрасіў яго вызваліць калег. Той прапанаваў: мы набяром вам новых, нашто вам гэтыя старыя кадры. Але Кузьма Венядзіктавіч здолеў пераканаць Сталіна. Калі Кісялёў вярнуўся ў Мінск і прыйшоў у наркамат, то ўсе супрацоўнікі былі на сваіх месцах. Гэты ўчынак характарызуе яго як асобу. Такая мужнасць! Таму Кузьма Венядзіктавіч і пакінуў аб сабе памяць як аб легендзе айчыннай дыпламатычнай службы.

ДАПКЮНАС А.В.: Гэта чалавечны высокамаральны ўчынак. Можа, не дыпламатычны… Але тое, што на пасадзе кіраўніка дыпведамства стаяў смелы чалавек, які адчуваў сваю адказнасць перад людзьмі, надзвычай важна. Гэта сітуацыя, якую кожны сённяшні дыпламат можа прыкласці да сябе. Калі б здарылася такое з табой, ты пайшоў бы адстойваць сваіх людзей?.. Дарэчы, у кожнага з тых, хто кіраваў Міністэрствам замежных спраў, былі свае выклікі часу. Гісторыя дыпслужбы не бясхмарная: наркамат утвараецца – скасоўваецца, далучаецца Беларусь да СССР – настае перыяд адсутнасці службы, потым яна зноў з’яўляецца…

ВЯЛІКІ А.Ф.: На маю думку, Кузьма Венядзіктавіч недаацэнены як дыпламат. Ён не быў, як кажуць, кар’ерным дыпламатам. Кандыдат медыцынскіх навук, тым не менш як годна прадстаўляў нашу рэспубліку на міжнароднай арэне, у прыватнасці ў ААН. Фактычна Кісялёвым закладваўся падмурак беларускай дыпламатыі. Потым Анатоль Гурыновіч быў і іншыя: я ўзгадваю толькі савецкі час.

ШЧАСНЫ У.Р.: Хачу падкрэсліць: часам асоба дыпламата прадвызначала самастойнасць нашай палітыкі. Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, напрыклад, прапанаваў рэзалюцыю аб пакаранні нацысцкіх злачынцаў. Яна прымалася Генасамблеяй ААН у 1946 годзе па ініцыятыве Беларусі. У 1959 годзе дзякуючы БССР была прынята рэзалю-




▲ Дэлегацыя БССР на чале з міністрам замежных спраў К.В. Кісялёвым (у цэнтры) на першай сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Лондан, 1946 год

Беларуская Думка



▲ У час першай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Лондан, 1946 год

цыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб міжнародным заахвочванні навуковых даследаванняў у барацьбе з ракавымі захворваннямі. Адным з канкрэтных вынікаў ухвалення гэтага дакумента стала будаўніцтва першага ў Беларусі медыцынскага анкалагічнага цэнтра. Тут вялікую ролю Кісялёва, як урача і навукоўца, нельга не адзначыць. І такіх прыкладаў шмат. Таму, вяртаючыся да аднаго з папярэдніх пытанняў, зазначу: гаварыць, што беларускія дыпламаты рухаліся абсалютна ў фарватары агульнасаюзнай дыпламатыі, не варта.

ШАДУРСКІ В.Г.: Калі больш дакладна сказаць, прадстаўнікі БССР мелі свой голас у савецкай дыпламатыі.

ШЧАСНЫ У.Р.: Анатоль Гурыновіч – пра яго асобна трэба сказаць. Былы партызан, ён зрабіў выдатную дыпламатычную кар'еру, працаваў міністрам замежных спраў нашай рэспублікі з 1966 па 1990 год. Дзякуючы яму БССР мела высокі аўтарытэт у міжнародных арганізацыях. Анатоль Емяльянавіч, у прыватнасці, актыўна ўдзельнічаў у Першым камітэце Генеральнай Асамблеі ААН, які займаецца пытаннямі раззбраення. Увагі і павагі заслугоўваюць і іншыя кіраўнікі знешнепалітычнага ведамства. Так, з 1990 па 1994 год Пётр Краўчанка быў міністрам замежных спраў спачатку БССР, а потым Рэспублікі Беларусь. Далей на гэтай пасадзе плённа працавалі Уладзімір Сянько, Іван Антановіч, Урал Латыпаў, Міхаіл Хвастоў, Сяргей Мартынаў. Усе яны зрабілі свой уклад у станаўленне беларускай дыпламатычнай службы і спрыялі павышэнню аўтарытэту нашай краіны на міжнароднай арэне.

ШАБЛЫКА Т.А.: **А што можна сказаць пра сучасную беларускую дыпламатыю?**

ШАДУРСКІ В.Г.: У нас ёсць усе падставы канстатаваць, што беларуская дыпламатыя актыўна працуе. Гэта галоўная выснова. Прычым яна ўжо мае сваё выразнае аблічча, свой вопыт і свае напрацоўкі, ведае і паважае свае гістарычныя карані.

ДАПКЮНАС А.В.: Мы сёння адкрыта кажам пра адметныя рысы беларускай дыпламатыі – дыпламатыі, якая адлюстроўвае нацыянальную ментальнасць: талерантнасць, спагадлівасць, жаданне вырашаць праблемы неканфліктна…

ШАДУРСКІ В.Г.: Так, гэта і зацікаўленасць у зніжэнні канфліктнасці ў рэгіёне Усходняй Еўропы. Спецыфічнае геапалітычнае становішча Беларусі, якое склалася гістарычна, якраз і дыктуе сённяшнюю выразнасць нашай дыпламатыі. Гэтая дыпламатыя нацыянальна скіраваная. Варта адзначыць, што МЗС з'яўляецца адным з асяродкаў падтрымання абедзвюх дзяржаўных моў. Вельмі важна тое, што ў Беларусі створана ўласная сістэма падрыхтоўкі дыпламатычных кадраў. З 1995 года ў Белдзяржуніверсітэце працуе факультэт міжнародных адносін. Намі падрыхтавана ўжо некалькі пакаленняў беларускіх дыпламатаў. І падручнікі ўласныя створаны, і дапаможнікі. Сістэма падрыхтоўкі нацыянальных дыпламатычных работнікаў развіваецца разам з айчыннай дыпламатыяй і дыпслужбай.

Лічбы і факты даказваюць – нашу краіну сёння паважаюць не толькі на постсавецкай прасторы. У год 100-годдзя дыпламатычнай службы можна канстатаваць, што да нас з вялікай увагай і павагай ставяцца і краіны далёкага замежжа. Беларускую дзяржаву ўсё часцей успрыма-

юць як міралюбівую і стабільную. Замежныя палітыкі і грамадскасць сталі лепш разумець знешнепалітычную спецыфіку і самастойнасць Беларусі. Міжнародныя мерапрыемствы, якія адбыліся ў нашай краіне ў апошнія гады, гэта яскрава прадэманстравалі.

ШАБЛЫКА Т.А.: **Андрэй Вадзімавіч, гэта пытанне менавіта да Вас як да аднаго з кіраўнікоў знешнепалітычнага ведамства нашай краіны. Сучасны перыяд развіцця беларускай дыпламатычнай службы – гэта лепшы час яе 100-гадовай гісторыі?**

ДАПКЮНАС А.В.: Ведаеце, перш за ўсё сёння ў мяне ёсць агульнае разуменне выкліку, які кідае нам складаны і супярэчлівы час. А вось адносна айчыннай дыпламатычнай службы можна дакладна сказаць – яна перажывае стан актыўнага развіцця. Ідзе сталенне Міністэрства замежных спраў Беларусі. Мы адчуваем тую ўвагу, якую дзяржава надае нашай службе. Заўважальнае сведчанне гэтага, апроч іншага, і падтрымка прапаноў міністэрства па заснаванні геральдыкі, дыпламатычных званняў, узнагарод і г. д.

Галоўны фактар поспеху ў дыпламатычнай працы, і спадзяюся, калегі гэта не аспрэчаць, – разуменне гістарычнага працэсу як цэльнага і непарыўнага. Трэба ведаць пра гэта глыбока, канкрэтна – з фактамі, з копіямі дакументаў, канкрэтнымі абставінамі. І без такога фундаменту, пра які ўжо сёння гаварылася, без гістарычнага падмурка дзейнасць дзяржаўнага чыноўніка, грамадзяніна, дыпламата не можа мець належнага сэнсу.

У 1991 годзе ў былых рэспубліках СССР утварыліся свае міністэрствы замежных спраў. Усе пачалі працаваць, здаецца, у аднолькавых умовах. Але ў нас, беларусаў, на маю думку, была перавага – магчымасць далучэння да традыцый. Моладзь, якая прыходзіла, вучылася ў ветэранаў дыпслужбы БССР, такіх, дарэчы, як Уладзімір Рыгоравіч Шчасны. На падмурку мінулай дзейнасці гэтых асоб выбудоўвалася сучасная дыпламатыя Беларусі.

18 студзеня ў Мінску ў Вялікім тэатры адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 100-годдзю дыпслужбы. Лічу, унікальная падзея. Гэта было самае прадстаўнічае мерапрыемства, на якое калі-небудзь запрашалі столькі людзей, у той ці іншай ступені датычных да дзейнасці МЗС. Прыемна і ўвага, выказаная ветэранам айчыннай дыпламатычнай службы. У гэтых людзей павінны вучыцца, браць з іх прыклад маладыя дыпламаты.

Такі чалавечы акцэнт – вельмі істотны фактар стварэння традыцый беларускай дыпламатыі, якая налічвае не адно стагоддзе. Маё разуменне, што дыпламат – такая прафесія, дзе фактар сілы чалавечай душы вызначальны. А сілу гэтую дае веданне традыцый, адчуванне фундаменту і спалучанасць са сваімі каранямі.

Я працаваў пэўны час у ААН і ведаю, як шмат рабілася там маімі папярэднікамі. І тое, што адбываецца сёння, – працяг іх працы. Наша краіна займае годнае месца сярод 194 дзяржаў свету. І я ганаруся тым, што беларусы так шмат робяць на міжнародным узроўні – часам нават тое, што не можа ніхто ў свеце. Калі сёння пішуць у газетах, што Беларусь стала перакрыжаваннем дыпламатычнай актыўнасці, маўляў, усе сцягі ў госці да нас, – дык гэта ж не проста так адбываецца. Гэта плён вельмі цяжкай і не заўсёды ўдзячнай працы. І шматлікія знешнепалітычныя пытанні сучаснасці – гэта выклік не толькі для кіраўніцтва нашай краіны, для ўрада ці міністра. Гэта выклік для кожнага дыпламата і грамадзяніна.

Мы імкнёмся выхоўваць дыпламатаў, якія ганарацца сваёй краінай, абараняюць інтарэсы свайго народа і не здрадзяць сваёй Радзіме. У іх павінна быць адчуванне, што краіна і народ аказалі ім давер прадстаўляць Беларусь на міжнародным узроўні, адстойваць нацыянальныя інтарэсы.

Калі самы малады аташэ, самы малодшы супрацоўнік МЗС зразумее, што ён у першую чаргу не чыноўнік, а грамадзянін, які грудзьмі стане за краіну, тады, вобразна кажучы, не будзе ніякіх абмежаванняў палёту нашага натхнення і творчай дыпламатычнай думкі.

**Падрыхтавала Таццяна ШАБЛЫКА**